# Быць нашчадкамі Перамогі

**У Гродзенскай вобласці дадзены старт інфармацыйна-адукацыйнаму інтэрнэт-праекту "#Гісторыя#Памяць#Будучыня.by", прысвечанаму 75-годдзю перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**

Праект будзе рэалізоўвацца на працягу студзеня — мая гэтага года. Прыняць удзел у ім прапанавана навучэнцам 9—11-х класаў і ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, класным кіраўнікам і куратарам вучэбных груп, кіраўнікам школьных музеяў.

Фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму, нацыянальнай ідэнтычнасці, умення канструктыўна жыць у сучасным свеце разглядаецца сёння як галоўная ўмова стабільнай будучыні ў нашай краіне.

— Пачынаючы гэты праект, мы ставілі некалькі мэт: садзейнічаць фарміраванню прафесійных кампетэнцый педагогаў у арганізацыі ідэалагічнага, грамадзянскага і патрыятычнага выхавання навучэнцаў і развіццю іх асобаснага патэнцыялу, актывізаваць працэс вывучэння гістарычных падзей на тэрыторыі роднага краю ў гады вайны праз выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, захаванне гістарычнай памяці пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Гродзенскай вобласці, — гаворыць адзін з распрацоўшчыкаў праекта метадыст цэнтра ідэалагічнай, выхаваўчай і сацыяльнай работы Гродзенскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Лілія Вацлаваўна Курылёнак. — Зараз прынцыпова важным з'яўляецца захаванне гістарычнай памяці аб ратных і працоўных подзвігах людзей у гады вайны, у тым ліку на тэрыторыі Гродзенскай вобласці. Выкананне гэтых задач у сучасных умовах працэсу лічбавай трансфармацыі адукацыі магчыма з прымяненнем перадавых тэхналогій, даступных і запатрабаваных моладдзю.

У планах — стварэнне вучэбных і развіццёвых мультымедыйных прадуктаў па гісторыі роднага краю ў гады Вялікай Айчыннай вайны: інтэрактыўнага календара падзей Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Гродзенскай вобласці, слайд-шоу "Юныя героі вайны Гродзенскай вобласці", Google-карты "Месцы памяці ахвяр халакосту" ў Гродзенскай вобласці, Google прэзентацыі "Праведнікі народаў свету ў Гродзенскай вобласці", электроннага банка відэаматэрыялаў, электроннай сцяны памяці "Памяць пра вайну ў маёй сям'і", электроннага банка метадычных распрацовак выхаваўчых мерапрыемстваў, правядзенне віртуальнай сустрэчы знаўцаў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і адукацыйнай сеткавай гульні, стварэнне электронных плакатаў-газет у сэрвісе WikiWall "Мы — нашчадкі Вялікай Перамогі".

Права карыстання атрыманымі мультымедыйнымі прадуктамі падчас рэалізацыі праекта атрымліваюць яго ўдзельнікі. У далейшым матэрыялы будуць размешчаны ў шырокім доступе, і магчыма іх выкарыстанне пры ўмове захавання аўтарскага права.

Праект будзе праходзіць у тры этапы: падрыхтоўчы, асноўны і заключны. Падрыхтоўчы этап ужо ідзе, і зараз фарміруюцца каманды ад раёна і ад устаноў прафесійнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, анкетаванне навучэнцаў у воблачных тэхналогіях з мэтай вывучэння іх цікавасці да падзей Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі малой радзімы. Матэрыялы размяшчаюцца на створаным сайце праекта "#Гісторыя#Памяць#Будучыня.by". Па зводнай табліцы ўдзелу кожная каманда можа бачыць сваё прасоўванне ў праекце.

Асноўны этап прадугледжвае пошук, вывучэнне архіўных матэрыялаў, сустрэчы з відавочцамі і ўдзельнікамі вайны, іх нашчадкамі, апытанне землякоў, сваякоў аб вядомых ім падзеях вайны на тэрыторыі раёна, выкананне творчых заданняў.

На заключным этапе ўстановы адукацыі вобласці арганізуюць інтэрнэт-галасаванне "Лепшы відэапрадукт "Май 45-га" і "Лепшая газета "Мы — нашчадкі Вялікай Перамогі".

У аўтарскую групу праекта, акрамя Л.В.Курылёнак, увайшлі настаўніца гісторыі і грамадазнаўства гімназіі № 1 Дзятлава Алена Вікенцьеўна Радомская і загадчык інфармацыйнага аддзялення Гродзенскага дзяржаўнага каледжа тэхнікі, тэхналогій і дызайну Наталля Іосіфаўна Вашчылава. У гімназіі № 1 Дзятлава назапашаны вялікі вопыт даследаванняў навучэнцаў аб Вялікай Айчыннай вайне і халакосце, у каледжы — стварэння віртуальных рэсурсаў.

Аўтары праекта лічаць, што ён не толькі дасць магчымасць прыцягнуць увагу моладзі да праблем вайны і міру, але будзе спрыяць іх канструктыўным зносінам у інфармацыйнай прасторы і IT-адукацыі.

А завершыцца праект рэальнай сустрэчай актыўных яго ўдзельнікаў. Адбудзецца таксама сустрэча з навукоўцамі, якія даследуюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны, прэзентацыя лепшых распрацовак і ўзнагароджванне самых актыўных удзельнікаў інтэрнэт-праекта "#Гісторыя#Памяць#Будучыня.by".